Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (103), 2017

**Филология**

*УДК 821.161.3-1Стральцоў.06*

# Паэзія М. Стральцова: стратэгіі перадолення маргінальнасці

А.В. Брадзіхіна

Паэтычная спадчына М. Стральцова разглядаецца ў артыкуле праз прызму тэорыі маргінальнасці. Аўтар акрэслівае асноўныя спосабы пераадолення героем свайго «ўскраіннага асяроддзя» і прыходзіць да высновы пра экзістэнцыйны характар адзіноты і дыхатамічнасць натуры лірычнага суб'екта, што, нягледзячы на мноства стратэгій, не дазваляе яму пазбавіцца ад свайго маргінальнага статусу.
**Ключавыя словы:** лірыка, маргінальнасць, вобраз двайніка, інтымная лірыка, лірычны суб'ект, вобраз, матыў, мастацкая сістэма.

The poetic heritage of M. Straltsou is considered through the prism of the theory of marginality. The author outlines the main ways to overcome the «marginal environment» by the main character and arrives at a conclusion about existentiality as a distinctive feature of loneliness, as well as dichotomous nature of the lyrical subject that, despite a bunch of strategies, do not allow him to escape from his marginal status.
**Keywords:** lyrics, marginality, image of the double, intimate lyrics, lyrical subject, image, motive, art system.

Яркая, самабытная лірыка Міхася Стральцова (1937–1987) выглядае і сёння надзіва сучаснай, нібыта створанай у XXI стагоддзі, бо ў сваім часе яна была з'явай хутчэй маргінальнай – адарванай ад літаратурнага мэйнстрыму праз прынцыповую апалітычнасць, «неграмадзянскасць», «несавецкасць». Уласцівыя вершам паэта сцішанасць інтанацый, максімальная вобразная шчыльнасць радка, паглыбленая рэфлексія, нават эгацэнтрызм, «напаўмістычнасць» (І. Запрудскі) [1, с. 87] ніяк не суадносіліся з патрабаваннямі партыйнасці-народнасці, сфармуляванымі сацрэалістычнымі канонамі. Гэта ў пэўным сэнсе вытлумачвае агульную няўвагу тагачаснай крытыкі да лірыкі М. Стральцова. Больш за тое, і пост-асэнсаванне яго вершаваных набыткаў нашымі сучаснікамі нярэдка спараджала дыяметральна супрацьлеглыя характарыстыкі. Да прыкладу, даследчыкі так і не сышліся ў пытаннях празрыстасці (Р. Станкевіч, А. Сідарэвіч, І. Запрудскі) або цьмянасці, «ускладнёнай метафарычнасці» (Б. Бур'ян, І. Гоўзіч) лірыкі паэта, традыцыяналізму (А. Макмілін) ці эксперыментальнасці (І. Запрудскі, А. Гурская) прыроды яго вершатворчасці, яе «дзённікавасці» (І. Запрудскі, А. Макмілін, Ю. Залоска) альбо «неаўтабіяграфічнасці» (Л. Дранько-Майсюк), аптымістычнай скіраванасці (П. Васючэнка, А. Макмілін) ці песімістычнай безнадзейнасці гучання (В. Акудовіч, І. Запрудскі, Р. Станкевіч) і інш. Такі роскід ацэнак, не ўтрымлівае, аднак, парадокса, бо ўсе пералічаныя палярныя адметнасці насамрэч уласцівыя *асобным* старонкам ці этапам творчасці паэта. Іншымі словамі, у кожным сваім арыгінальным зборніку – «Ядлоўцавы куст» (1973), «Цень ад вясла» (1979) і «Свеце мой ясны» (1986) – перад намі прадстае абсалютна *новы* М. Стральцоў. Аб'ядноўвае гэтую размаітую гаму настрояў, пачуццяў і паэтычных прыёмаў у цэласную сістэму ўзгаданая вышэй **ідэя маргінальнасці.** Стварыўшы ў прозе красамоўны сімвал – сена на асфальце, у лірыцы творца – свядома ці не – рэалізаваў яго паслядоўна як на суб'ектным узроўні, так і пры мадэляванні мастацкага свету ў цэлым.

Тэрмін «маргінальнасць», уведзены амерыканскім сацыёлагам Р.Э. Паркам (эсэ «Чалавечая міграцыя і маргінальны чалавек»), замацаваўся ў навуцы яшчэ ў 1928 г. і з цягам часу стаў запатрабаваным у філасофіі, псіхалогіі, культуралогіі і літаратуразнаўстве. Паводле Л. Кемалавай, «маргінальная асоба ўбірае ў сябе спецыфіку маргінальнасці як дуальнай,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паводле сваёй прыроды, з’явы. Вымалёўваецца сацыяльна-псіхалагічны партрэт асобы, што характарызуецца наступнымі рысамі: адзінота, прыгнечанасць, пачуццё ізаляванасці, няпэўнасці, разгубленасці. <…> Пры гэтым маргінальныя паводзіны маюць не толькі дэструктыўныя формы праяў у выглядзе дэвіяцыі, але і канструктыўныя, што дазваляе разглядаць іх не як анамалію, а як іншую норму» [2, с. 97]. Калі дадаць сюды падкрэсленыя паслядоўнікам Р. Парка Э. Стоўнквістам дэзарганізаванасць, ашаломленасць, трывожнасць, адчуванне «непераадольнай сцяны» і няўдачлівасць, унутраную напружанасць, адчужанасць, роспач, эгацэнтрызм, дуальнасць свядомасці, то мы атрымаем ледзьве не поўны спіс скразных, уласцівых усім тром паэтычным зборнікам М. Стральцова, матываў.

Прычым вызначальнай катэгорыяй, першавытокам, які спараджае комплекс іншых настрояў і пачуццяў, у лірыцы паэта выступае адзінота. М. Стральцоў, паводле ўспамінаў сучаснікаў, «быў дужа нестандартны чалавек. Вельмі ўжо НЕПРАНУМАРАВАНЫ» (А. Асташонак) [3, с. 19]; «не такі ва ўсім, і гэтага яму не маглі дараваць» (А. Кудравец) [4, с. 236]. Паэт проста не ўпісваўся ў сучаснае яму грамадства, што ў спалучэнні з інтравертнасцю, абвостранай чуйнасцю да кожнай праявы жыцця і ў пэўным сэнсе неабароненасцю перад яго нягодамі сведчыць пра экзістэнцыйны характар яго самоты, якая, у сваю чаргу, фарміруе «ўскраіннае асяроддзе». У кантэксце тэорыі маргінальнасці апошняе абазначае сферу процістаяння ўсяму, што прыгнятае свабоду асобы і вызначае спосабы функцыянавання сацыякультурнага жыцця. Думаецца, М. Стральцоў ясна ўсведамляў першаснасць сваёй адзіноты, пішучы ў адрасаваных Але Сямёнавай лістах пра схільнасць уласнай натуры да «splendid isolation» [5, с. 66] (бліскучай адзіноты) і адсутнасць «талентаў “общительности”» [5, с. 73], а таму і ў сваёй аўтапсіхалагічнай лірыцы паслядоўна ствараў вобраз «выгнанага патрыцыя».

Усёахопны, татальны стан стральцоўскай самоты распаўсюджваецца на любую праяву рэчаіснасці, надзеленую душой. Гэтай якасцю ў паэта валодае кожная прыродная з’ява (і мы тут маем справу не з прыёмам метафарычнага ўвасаблення, а менавіта з канцэптуальным антрапамарфізмам). Асаблівай увагі заслугоўвае вобраз адзінокай зоркі на фоне начнога неба, у шэрагу сабе падобных (вершы «Ноччу, тым часам, як спаў…», «Лета. Ноч»), што, відавочна, суадносіцца са станам, іманентна ўласцівым лірычнаму герою:

І днём між людзей ты ходзіш
нейкім далёкім рэхам
і цыгарэт выкурваеш болей,
чым прамаўляеш слоў [6, с. 100].
(«Аднойчы ноччу…»)

Шматразовы зварот да хвалюючай тэмы, пільны і ўважлівы, як праз павелічальнае шкло, разгляд стану адзіноты дазволіў паэту вылучыць самыя нечаканыя яго ракурсы: згаданая вышэй самота сярод людзей, мітуслівая адзінота сяброў, якія доўга не бачыліся («Прыехаў сябра»), бязлюддзе як фізічная адсутнасць («Надыходзіць пара…»), бадзёрая адзінота восені («Яшчэ не ўсчаліся вятры…»), сляпая адзінота іншага, нетутэйшага свету («Акварэлі»). Урэшце, самота персаніфікуецца і набывае пачварнае аблічча, узмоцненае начным трызненнем лірычнага суб’екта: «Ты з адзінотай твар у твар – // Хвіліна гэткая благая!» [6, с. 118]. У выніку герой асуджаны на бясконцую рэфлексію, перагляд сваёй «душэўнай гаспадаркі» [6, с. 118] і вынясенне самапрысуду («сябе карай // За дзень, за сваркі і за чаркі» [6, с. 118]). Такі карпатлівы мастацкі аналіз М. Стральцовым катэгорыі самоты не зводзіцца, аднак, да спробы яе тыпалогіі, а абумоўлены хутчэй імкненнем да пазбаўлення маргінальнага статусу.

Ад зборніка да зборніка асэнсаванне стральцоўскім homo solus феномена адзіноты паглыбляецца. Калі ў кнізе «Ядлоўцавы куст» паэт абмяжоўваецца канстатацыяй самотнасці разнастайных праяў свету, то ўжо ў другім зборніку – «Цень ад вясла» – яго лірычны герой пачынае шукаць спосабы пераадолення мяжы «ўскраіннага асяроддзя», хаця выбудаваная ім стратэгія пакуль суадносіцца з эскапізмам – уцёкамі ад праблемы ў «пакутны рай» [6, с. 84], у вершы. Тут, ва ўласна прыдуманай рэчаіснасці, герой адчувае сябе далучаным да супольнасці, найперш прыроднага свету, бо, па словах самога паэта, «чалавек, у якога ёсць свой свет, не адзінокі ўсё ж» [5, с. 76]. Нарэшце, у апошняй прыжыццёвай кнізе «Свеце мой ясны» ранейшая глыбока прыхаваная бравада сваёй самотнасцю як адзнакай абранасці (адзін вобраз «выгнанага патрыцыя» чаго варты!) саступае ўсведамленню катастрафічнасці і разбуральнасці ізаляцыі, бо пазбаўляе асобу руху – магчымасці самаразвіцця і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

самаўдасканальвання. І тады свабода ад чалавечых сувязяў абарочваецца турмой, а душа, застылая ад бяздзейснасці («ні развітання, ні спаткання» [6, с. 138]), пакутуе ад вусцішнасці свайго «ўскраіннага асяроддзя»:

І што ні болю, ні шкадобы
Не накавана яму
Калі бывае даспадобы
Няславіць волю, як турму, –

Ні развітання, ні спаткання,
А толькі вусцішнасць быцця:
Нібы пра згубнае каханне
Пяе няўцямнае дзіця [6, с. 138].

(верш «За вёскаю, на адзіноце…»)

Асэнсаванне наяўнасці мяжы, пасля якой працэс адчужэння набудзе якасці незваротнасці («Аж скаланецца раптам сэрца, // Ліхой збаяўшыся мяжы» [6, с. 138)], прыводзіць лірычнага героя да высновы, што пераадоленне сваёй адзіноты выступае адзіным шляхам выратавання і захавання цэласнасці асобы, што менавіта ў чалавечай еднасці і эмпатыі заключаецца сэнс жыцця: «Ды толькі ты, з людзьмі святая еднасць, // Мяне і далей па жыцці насі» [6, с. 106] (вершы «Жыццё, жыццё… Не першы, не апошні…», «Разам з людзьмі» і інш.).

Таму выгнаны патрыцый вымушаны шукаць падтрымку найперш у сяброўстве («Два подступы да верша») ці каханні («Без парывання, без жадання…»). Ён прагне распазнаць роднасную асобу сярод мноства абязлічаных чалавечых твараў, але, на жаль, поўнага паразумення, зліцця дзвюх душ не адбываецца. Максімум, на што можа разлічваць лірычны герой ад акаляючых людзей, – на ўніканне пустаслоўя, ветліва-абыякавых парадаў, словаў фальшывай спагады, якія адбіваюцца болем у сэрцы і выклікаюць нечакана рэзкую яго рэакцыю («Нервы», "Трымайся!" – і розныя словы…»). Па сутнасці, ён можа прэтэндаваць хіба на шчырае чалавечае маўчанне, ці, кажучы перыфразай самога М. Стральцова, на тое, каб «пастаяць / пагрэцца ля чыёсьці душы», і такім чынам кола замыкаецца. Патлумачым.

Маўчанне (немата, цішыня, здранцвенне), як і холад, у мастацкай сістэме паэта выступаюць вобразамі з трывалай негатыўнай семантыкай і неадменна карэлююць з адзінотай, забыццём, незапатрабаванасцю, адчужэннем. У выніку апісаная вышэй стратэгія аказваецца бясплённай, і лірычны герой мусіць шукаць іншыя спосабы камунікацыі. Спрабуючы вырашыць балючыя праблемы ўласнай экзістэнцыі, ён уступае ў дыялог з часам, ноччу, лёсам, хаця ў гэтых размовах больш пытанняў, чым адказаў («Летняй ноччу пад зорным небам», «Размова з часам», «Вечаровы ўспамін пра Сож» і інш.). Урэшце стральцоўскі homo solus знаходзіць ідэальнага суразмоўцу – сябе, што выклікае характэрны для маргінальнай асобы эфект раздвоенасці: «І так захочацца пагрэцца // Ля ўласнай цёплае душы» [6, с. 138].

Дыхатамічнасць натуры лірычнага героя, «яго раздвоенасць, несупадзенне з самім сабой» [7, с. 68] адзначала яшчэ Л. Турбіна. Такая адметнасць светаўспрымання натуральным чынам спарадзіла наяўнасць шматлікіх вобразаў двайнікоў, і з кожным зборнікам іх колькасць павялічвалася. Размовы з унутраным голасам – матыў, досыць распаўсюджаны ў паэтычнай творчасці ўвогуле, – у М. Стральцова набывае форму спрэчкі паміж довадамі сэрца і розуму, бо «Зусім не тое тчэцца ў сэрцы, // Што часам трызніць галава» [6, с. 72] (вершы «Прайшло, мінулася, як дым…», «Непагодлівы дзень у гарах», «Выпадкова падслуханая размова», «І рытмы тыя, ды ўжо лад…» і інш.). Іншымі словамі, у галаве героя гучаць два галасы, і спробы іх прымірэння, тоесныя імкненню ўз'яднання з самім сабой праз стратэгію travesty (узаемапераходу), аказваюцца марнымі. У выніку аддзеленасць, адстароненасць лірычнага суб'екта ад сябе ўзрастае, і ён не можа пазбавіцца ад цьмянага адчування, што пражывае чужое, паралельнае жыццё, з'яўляецца «з другога свету прыбышом», і набывае рэдкую здольнасць, трапна сфармуляваную наступнымі радкамі: «Нібы сябе ты з боку разглядаеш, // Нібы сябе ты слухаеш знутры» [6, с. 144] (вершы «Бяда знянацку налучыла…», «Пад шоргат кропель дажджавых», «Усхапіўся агонь. Дым курыць…» і інш.). З'яўленне ў вершах фізічных, матэрыяльна ўвасобленых двайнікоў не азначае, аднак, з'яўлення ролевых герояў, нягледзячы на тое, што збліжэння арыгінала і яго копіі так і не адбываецца:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

І ў гэтай будцы пад дажджом,
У нейкай роспачы вялікай,
Сябе за даўнім рубяжом
Убачыў ён – і не паклікаў.

Не мог, а мо не захацеў.
Не абазваўся нейкім знакам.
А той у дзіўнай віднаце
Ці то ўсміхаўся, ці то плакаў [6, с. 137–138].
(«Пад шоргат кропель дажджавых…»)

Зрэшты, і лёсы ролевых герояў дзякуючы згаданай вышэй здольнасці аўтапсіхалагічнага персанажа да эмпатыі («Умей сябе ўбачыць праз другога, // Смяяцца шчыра, плакаць без слязы» [6, с. 106]), да бясконцай спагады і спачування прымерваюцца ім на сваё жыццё, праўда, ужо з іншай мэтай – спазнання ўласнай душы. Такая стратэгія masking (пераапрананне) спрацоўвае, да прыкладу, у вершы «На аўтобуснай станцыі», дзе ўзнікае вобраз маргінала (у абыходкавым, будзённым сэнсе гэтага слова) з авоськай у руцэ, шнарам на твары і татуіроўкай «Не забуду матку родну» (тут, дарэчы, паўстае яшчэ адна скразная праблема лірыкі М. Стральцова – моц і лёсавызначальнасць слова, якое набывае значэнне таўра, але гэта тэма асобнай гаворкі). І нават з такім дзіўным выпадковым персанажам стральцоўскі герой знаходзіць кропкі судакранання, якія зводзяцца да агульнага болю, душэўнай неўладкаванасці і непрыкаянасці: «І стаіць. Блукаюць думкі, // Твар у ранніх змаршчаках. // Ну і я стаю. Ні сумкі, // Ні авоські у руках» [6, с. 46]. Гэтае таўро, якое пакінула жыццё, не дазваляе асобе быць саматоеснай, а таму «Магчымасць на волі вольна // Шчэ раз быць самім сабой» [6, с. 103] – запаветная мара і адначасова недазваляльная раскоша для стральцоўскага героя.

Спасціжэнне «я-сапраўднага» магчымае толькі пры ўмове пазбаўлення ад «шалупіння» дарослага жыцця, праз незаплямленую душу дзіцяці. Матывы бясконцага вяртання ў мінулае, у бесклапотныя часы маленства, імкненне ператварыцца ў сябе-хлапчука з наіўным сінім паглядам грунтуюцца на стратэгіі morphing (трансфармацыі) і падпаракоўваюцца яшчэ адной мэце –«адчуць сябе абароненым» [1, с. 88] (вершы «Такая жоўтая вада…», «Хачу я з тым, з маленства хлапчуком…», «Два вершы» і інш.). М. Стральцоў тут дэманструе максімальную набліжанасць аўтара да свайго героя, інакш кажучы, той самы аўтабіяграфізм. Узгадаем адзін з лістоў паэта: «Я не такі ўжо капрызлівы і эгаіст. Толькі мне цяпер так хочацца, каб нехта, як малога, пагладзіў па галоўцы, каб першай парой я не баяўся за той ці іншы душэўны рух, каб адвучыўся трохі ад душэўнай зацятасці…» [5, с. 72]. Здавалася б, гэты тып двайніцтва павінен быць самым плённым для дасягнення жаданага, але катарсіс у М. Стральцова заўсёды надзвычай балючы. Спробы самапазнання праз успамін больш нагадваюць бясконцы працэс жорсткага катавання безабароннай душы:

Лёг, маленькі-маленькі,
На шамоткім плашчы
І падціснуў каленкі
Перад мечам начы.

«Хто ты? Што ты?» – пытае,
Ды адказу майго
Не чакае, карае:
«Хто ты? Што? Да чаго?»

Безадхланна, бясконца
Ноч пытанні прадзе.
О, хутчэй бы ўжо сонца
Новы вывела дзень! [6, с. 47]
(«Летняй ноччу пад зорным небам»)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Аднак сонца не можа пазбавіць героя ад самага страшнага яго двайніка – Чорнага Чалавека, які працягвае пераследаваць яго днём. Гэта вобраз, пра які М. Стральцоў вельмі любіў разважаць у жыцці, але ў вершы ўвёў толькі аднойчы – у верлібр «Аднойчы ноччу…». Адзін з самых загадкавых, містычных і страшных твораў паэта ўяўляе сабой трызненне наяве, сустрэчу з падсвядомым. Чорны Чалавек адначасова нагадвае нябожчыка, д'ябла і зрынутага анёла і з'яўляецца персаніфікаваным увасабленнем экзістэнцыйнага жаху героя, выціснутым з падсвядомасці яго спараджэннем, з існаваннем якога арыгінал мірыцца не згодны, пазнаць адзін з бакоў сваёй душы ў гэтым неадчэпным ценю не жадае і таму зноў застаецца чужым самому сабе.

Такім чынам, дыхатамічнасць і супярэчлівасць натуры, яе экзістэнцыйная адзінота – якасці, што ўсведамляюцца лірычным героем М. Стральцова і інспіруюць яго спробы пераадолення свайго «ўскраіннага асяроддзя». Аднак ні эскапізм, ні спробы камунікацыі з чалавечым светам, ні разнастайныя стратэгіі ўз'яднання двайнікоў (travesty, masking, morphing) не становяцца эфектыўнымі, не пазбаўляюць асобу свайго маргінальнага статусу, што абумоўлівае скразны матыў самапазнання і агульную інтанацыю «нетутэйшай тугі», якая аб'ядноўвае ўсе тры зборнікі паэта ў адзінае мастацкае цэлае.

## Літаратура


1. Запрудскі, І. «Міг нетутэйшае лагоды»: паэтычныя сны-неспадзевы Міхася Стральцова / І. Запрудскі // Маладосць. – 2012. – № 2. – С. 83–90.
2. Кемалова, Л.И. Маргинальная личность: социально-психологический портрет / Л.И. Кемалова // Вісник СевДТУ. – Севастополь : Вид-во СевНТУ, 2008. – Вип. 86 : Філософія : зб. наук. пр. – С. 94–97.
3. Асташонак, А. За мяжою звычайнага / А. Асташонак // Крыніца. – 1994. – № 9. – С. 19.
4. Кудравец, А. «Як лісцё на голлі аддрыжым»: З нагоды 75-годдзя Міхася Стральцова / А. Кудравец // Дзеяслоў. – 2012. – № 1. – С. 231–240.
5. Сямёнава, А. Бэзавы попел / А. Сямёнава // Крыніца. – 1994. – № 9. – С. 35–86.
6. Стральцоў, М.Л. Выбраныя творы / М.Л. Стральцоў ; уклад. і камент. М. Скоблы; прадм. А. Сідарэвіча. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 652 с.
7. Турбина, Л. Будто кто-то за его спиной / Л. Турбина // Першацвет. – 1990. – № 12. – С. 68–69.


Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 12.11.2016

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ